## Вытокі, народны фальклорны ансамбль. г. Віцебск

**Народны фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Вытокі»** заснаваны ў 1989 годзе на базе Віцебскага абласнога навукова-метадычнага Цэнтра народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы, з 1992 года атрымаў званне «народны».

Мастацкім кіраўніком і балетмайстрам быў заслужаны дзеяч культуры Беларусі **Серыкаў Іван Арцёмавіч** (02.07.1919–20.11.1997). Заслужаны дзеяч культуры БССР (1968). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1945–1961 гг. – балетмайстар ансамбля песні і танца Беларускай ваеннай акругі. Мастацкі кіраўнік народнага ансамбля песні і танца «Маладосць» (з 1961 года). На працягу апошніх 10 гадоў свайго жыцця Іван Арцёмавіч працаваў у Віцебскім абласным метадычным Цэнтры народнай творчасці на пасадзе галоўнага балетмайстра. У гэты час заснаваў фальклорны ансамбль «Вытокі». Падчас працы ў АМЦНТ склалася харэаграфічная школа І. А. Серыкава з прадстаўніцтвам калектываў на Лепельшчыне, Сенненшчыне, Гарадоччыне, у г. Віцебску і інш.

Разам з хормайстрам і музычным кіраўніком Вішняковым Аляксандрам Уладзіміравічам Серыкаў І. А. стварыў творчы мабільны калектыў – узор стылізаванага фальклорна-этнаграфічнага ансамбля канца XX ст. У складзе ансамбля была вакальная група (стыль выканання акадэмічна-народны з вольным імкненнем да архаічнай галоснасці), танцавальная група (стылізаваны народны стыль), аркестравая група (з традыцыйным для Паўночнай Беларусі складам інструментаў: скрыпка, жалейка, дудка, цымбалы, саломка, гармонік, барабан, «певень»). Эскізы касцюмаў, распрацаваныя мастаком Ю. Піскуном, былі створаны на аснове этнаграфічных даследаванняў Дубровенскага, Віцебскага, Лепельскага, Гарадоцкага строяў. Гэта быў першы калектыў у вобласці, у якім была акцэнтавана ўвага на індывідуалізацыі касцюма кожнага ўдзельніка калектыву.

Рэпертуар ансамбля складалі песенныя і танцавальныя творы, узнікшыя на рэгіянальным матэрыяле. Вызначаліся канцэртныя праграмы «Паазерскія замалёўкі», «Траецкія ігрышчы», «Беларускае вяселле», аснову якіх складалі стылізацыі вясельных, траецкіх, калядных, жніўных і іншых аўтэнтычных фальклорных узораў Віцебшчыны. У харэаграфічным паказе прадстаўлялася своеасаблівасць і разнастайнасць танцавальнага фальклору лакальных традыцый Віцебшчыны: полька – Пастаўская, Браслаўская, Глыбоцкая, Гарадоцкая; кадрыля – кірмашоўская, Езярышчанская, Ульянавіцкая, танцы – «Расшугалец», «Ярыца», «Зязюля», «Дубравачка», «Прымакі», «Дудары», «Свінні ў рэпе» (з рэпертуару дзеда Вішнякова А. У. з Мёршчыны), «Пляскач», «Прабегліца», «Лучыначкі», «Стрыкач». Песенны матэрыял мае мясцовы каларыт: «А ў гародзе ярыца», «Ах ты дуй», «А ў нашага пана», «Ты дарога мая», «А дзе ж тая крынічанька» (з рэпертуару маці Івана Арцёмавіча з Дубровеншчыны). Шматлікія этнафальклорныя экспедыцыі давалі падставу для развіцця творчасці. Варажба з гарохам на бутэльках стала асновай стварэння танца «Бутэлечкі» з сакральна-магічным зместам архаічнага стылю, што на пачатку 90-х гадоў XX ст. з'яўлялася наватарствам.

Ансамбль «Вытокі» – удзельнік Міжнароднага фальклорнага свята «Славянскае кола» (Камянец-Падольскі, Украіна, 1992), Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» (1996), абласных святаў «Іграй, гармонь» (Віцебск, 1997), фестывалю «Беларуская песня-93» (Беласток, Польшча), шматлікіх абласных фестываляў і конкурсаў.

Ансамбль спыніў сваю дзейнасць у 1998 годзе ў сувязі са смерцю Івана Арцёмавіча. Калектыў-пераемнік – узорны вакальна-харэаграфічны ансамбль «Перапёлачка» віцебскай гімназіі № 3 г. Віцебска (мастацкія кіраўнікі – Вішнякоў А. У. (1993–2009), Шэвелева Х. Л. (з 2010 года)) – захоўвае традыцыі калектыву – яркай зоркі фальклорнага сузор'я Віцебшчыны канца XX ст.

Іван Арцёмавіч аказваў танцавальным калектывам вобласці кансультацыйна-практычную дапамогу, садзейнічаў у падборы рэпертуару. Багатая танцавальная спадчына І. А. Серыкава стала асновай для арганізацыі абласнога конкурсу харэаграфічных калектываў «Прыдзвінскія карункі». Абласное мерапрыемства прапісалася ў Гарадку. Звыш 800 аматараў народнага танца прынялі ўдзел у конкурсе на лепшае выкананне аўтарскіх танцаў Івана Серыкава, арыгінальную балетмайстарскую пастаноўку, якая адлюстроўвае беларускія матывы і нацыянальную ідэю.

### ЛІТАРАТУРА

1. **Кернажыцкая, Л.** Вопыт і праблемы захавання аўтэнтычнага фальклору ў дзейнасці фальклорных калектываў Віцебшчыны / Л. Кернажыцкая // Народная культура Віцебшчыны : матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі «Працэсы мадэрнізацыі народнай культуры і вопыт устаноў культуры і адукацыі Віцебшчыны па захаванню традыцый», 26–27 мая 2005 г. / рэдкал.: Л. Вакар [і інш.]. – Віцебск : ВДУ імя П. М. Машэрава, 2007. – С. 182–183.
2. **Кишкович, И. Т.** Сериков Иван Артемьевич / И. Т. Кишкович // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / редкол.: Т. В. Белова [и др.]. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2 : Витебская область : в 2 кн. – Кн. 2. – С. 460.

3. **Прыдзвінскія** карункі: (народная танцавальная спадчына Віцебшчыны) / Н. В. Уліновіч [і інш.] ; рэдкал.: Ю. В. Кузьмянкова [і інш.] ; рэд. муз. твораў: Д. В. Лабука, А. П. Слінькова. – Мінск : БудМедыяПраект, 2020. – 420 с.
4. **Серыкаў** Іван Арцёмавіч // Наш цэнтр. Наша гісторыя. Наша будучыня: да 80-годдзя стварэння абласных цэнтраў народнай творчасці / склад.: Т. М. Яскевіч, Р. І. Вайцяхоўская ; рэдкал.: В. В. Антоненка [і інш.]. – Мінск : ІВЦ Мінфіна, 2019. – С. 74.
5. **Сцепановіч, У.** Кадрыля яго жыцця... / У. Сцепановіч // Віцьбічы = Витьбичи. – 2009. – 18 июля. – С. 6, 11.
6. **Сцепановіч, У.** Таленту нязгасная зорка / У. Сцепановіч // Народнае слова. – 2002. – 23 крас. – С. 6.